**УДК 82.0:821.161.3.09-14**

**Садко Людміла Міхайлаўна**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дактарант Цэнтра даследаванняў
беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
Мінск, Беларусь

**Lyudmila Sadko**
PhD in Philology, Associate Professor,
Doctoral Student
Research Centre of Belarusian Culture,
Language and Literature of the National
Academy of Sciences
Minsk, Belarus
konovod1@yandex.ru

# ПОЛІСІСТЭМНЫ ХАРАКТАР РАННЯЙ ЛІРЫКІ М. ТАНКА

# POLYSYSTEMIC CHARACTER OF M. TANK'S EARLY LYRICS

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці ранніх вершаў М. Танка зборніка «На этапах» з пазіцый тэорыі і практыкі полісістэмнага падыходу. Зроблены высновы аб полісістэмным, поліпарадыгмальным характары аўтарскай манеры паэта, адзначаны рысы

складанага і арганічнага адзінства розных эстэтычных і паэтычных сістэм і кірункаў, як уласна беларускіх, так і сусветных, як традыцыйных, так і наватарскіх. Прааналізаваны разнастайныя рэпертуарныя мадэлі, пачынаючы ад фальклорна-міфалагічных, рамантычных, да «перадзвіжніцкіх», авангардысцкіх і сацрэалістычных.

Ключавыя словы: *полісістэма*; *рэпертуарная мадэль*; *М. Танк; рамантызм*; *«перадзвіжнікі»*; *фальклорна-міфалагічныя вобразы*; *авангардызм*; *сацыялістычны рэалізм*.

The article examines the features of M. Tank's early poems in the collection *At the Stages* from the standpoint of the theory and practice of the polysystemic approach. Conclusions are made about the polysystemic, polyparadigmatic nature of the poet's manner, the features of a complex and organic unity of various aesthetic and poetic systems and trends are noted, both Belarusian and global, traditional and innovative. Various repertory models are analysed, ranging from folklore/mythological and romantic to «itinerant», avant-garde and those of socialist realism.

Key words: *polysystem*; *repertory model*; *M. Tank*; *romanticism*; *«itinerants»*; *folklore and mythological images*; *avant-garde*; *socialist realism.*

У цэнтр грамадска-культурнага жыцця 1930-х гг. ва Усходняй і Заходняй Беларусі трапляюць ідэі разбурэння духоўных каштоўнасцей і нацыянальных традыцый. Ва Усходняй частцы ў гэты перыяд пануюць рэпертурэмы будаўніцтва новага жыцця, сацыялістычнага рэалізму, класавай барацьбы – «уладу набірала арыентацыя, бадай, выключна на ўслаўленне, на ідылічнасць, на тэматычна аднабокі паказ дзяжурнай бадзёрасці, радасці» [1, с. 63]; у Заходняй – палітыка антыбеларусізацыі, разбурэння пераемнасці нацыянальных літаратурных і культурных традыцый.

Цэлы шэраг айчынных аўтарытэтных даследчыкаў у розныя гады звяртаецца да вывучэння мастацкага феномена М. Танка, аднаго з самых яркіх прадстаўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, асэнсавання танкаўскай творчай індывідуальнасці, полісістэмнай эстэтычнай і паэтычнай арганізацыі твораў паэта. У. Калеснік, Дз. Бугаёў, М. Арочка, В. Рагойша, А. Верабей, М. Мікуліч адзінагалосна падкрэсліваюць, што мастацкая адметнасць лірыкі М. Танка сфарміравалася на скрыжаванні глыбокага разумення народнага жыцця, нацыянальна-патрыятычных ідэалаў, заангажаванасці самымі вострымі праблемамі сацыя-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі і «багатага мацерыка еўрапейскай цывілізацыі і культуры, аб чым маглі толькі марыць пісьменнікі па гэты бок рыжскай мяжы» [2, с. 13].

М. Арочка, даследуючы раннюю творчасць паэта «на пераломе жалеза і песні», задае слушнае пытанне: «Ці можна арганічна з'яднаць, зліць гэту паэзію шурпатых далоняў, незагойных ран, стогнаў у катоўнях з паэзіяй тонкіх адчуванняў, красы, ды так, каб яны ўзаемапранікліся паміж сабой на ўнутраных асновах» [3, с. 63]. Неабходна адзначыць, што даследчык акцэнтуе ўвагу на рысах «з'яднання», «зліцця», «узаемапранікнення» розных пачаткаў і сістэм сацыя-культурнага характару ў мастацкай спадчыне гэтага аўтара. Дз. Бугаёў указвае, што паэт рашуча выступаў супраць простага капіравання народнай творчасці, запазычання з яе рэпертуарных мадэляў: «ён умеў творча пераўвасобіць народныя здабыткі, паставіць іх на службу

актуальным паэтычным задачам свайго часу» [4, с. 34]. У. В. Гніламёдаў асабліва выдзяляе ў творчым лёсе М. Танка «ўдзел у рэалізацыі надзвычай зманлівага праекта – прымірыць і зрабіць сябрамі дзве супрацьлегласці – жыццё і рэвалюцыю, паэзію і камунізм» [5, с. 129].

Дакладна вызначае канвергентнасць, узаемадзеянне розных мастацкіх сістэм у творчасці М. Танка і В. П. Рагойша, падкрэсліваючы, што «нельга не ўлічваць пэўнага ўплыву на раннюю творчасць М. Танка як савецкай (Маякоўскі, Ясенін, маладнякоўцы), так і польскай паэзіі, у тым ліку фармалістычнай» [6, с. 18]. Даследчык выказвае таксама цікавыя назіранні пра асаблівасці танкаўскага вобразнага мыслення, у якім «добра развіты мастацкі слых і зрок» [6, с. 49]. Бясспрэчна, узаемаўплывы розных родаў мастацкіх сістэм – літаратуры, жывапісу, музыкі – значна ўзбагачаюць выяўленчую палітру аўтара, дазваляюць гаварыць пра адметныя і арыгінальныя прыёмы пісьма. Сродкі мастацтваў накшталт музыкі праяўляюць сябе, разгортваюцца ў часе, а магчымасці жывапісна-выяўленчых рамёстваў трансліруюцца ў прасторы. Пра талент мастакоў слова, у чыіх творах выразна праяўляюць сябе магчымасці і прасторавых, і часавых мастацтваў, варта гаварыць як пра асаблівую, сінтэтычную манеру, арыгінальны стыль.

А. Л. Верабей, даследуючы ўзаемасувязі творчасці беларускага класіка і польскай літаратуры, пераканаўча даводзіць, што танкаўская творчая індывідуальнасць склалася на перакрыжаванні цэлага шэрагу розных мастацкіх з'яў: «На характар і ступень засваення М. Танкам традыцый рамантычнай паэзіі (рускай, польскай, украінскай) уплывалі таксама асаблівасці яго таленту (паэта-рэаліста і адначасова паэта-рамантыка), умовы, у якіх развівалася заходнебеларуская літаратура, а таксама агульныя тэндэнцыі развіцця еўрапейскай паэзіі ў 1920–1930-я гады. У асобных вершах пачатку 1930-х гадоў выяўлялася знешняе засваенне маладым паэтам розных традыцый: "старой" рамантычнай і "новай" пралетарскай паэзіі» [7, с. 106]. Я. Чыквін дадае: «Нічога дзіўнага, што ён (М. Танк. – *Л. С.*), вырастаючы як паэт на стыку трох культур, будзе адчуваць патрэбу, як некалі Максім Багдановіч, узбагачаць беларускую культуру высокімі набыткамі рускай і польскай класікі» [8, с. 100]. Г. К. Тычко падкрэслівае, што эстэтыка-літаратурныя погляды М. Танка сінтэзаваліся на аснове творчай трансфармацыі літаратурных традыцый, вопыту Я. Купалы, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі, іншых майстроў слова і здабыткаў неканвенцыйнай, эксперыментальнай паэзіі: «Плённа наследуючы класічныя традыцыі, малады паэт быў захоплены ідэяй наватарскага пошуку» [9, с. 109].

У ранняй лірыцы М. Танка выразна праяўляюць сябе авангардысцкія тэндэнцыі. Размова вядзецца пра асаблівую ролю мастака і мастацтва ў сучасным грамадстве. Яшчэ ў першай палове XIX ст. сенсімaністы і фур'ерысты, прыхільнікі сацыяльнага ўтапізму, прызнавалі за мастаком значную грамадскую ролю, бачылі яго місію ў выяўленні вялікіх ідэй свайго часу, прамым садзейнічанні мэтам грамадскага пераўтварэння. У сацыякультурных умовах Заходняй Беларусі і абставінах нацыянальна-вызва-

ленчага руху творы М. Танка бяруць на сябе функцыю служэння сацыяльнаму ідэалу свабоды Бацькаўшчыны. Авангардызм у мастацтве з эстэтычнай праграмай абнаўлення свету, разбурэння старых законаў і нормаў, пошукамі новых, незвычайных сродкаў выяўлення формы і зместу твораў стаў паслядоўным адлюстраваннем філасофскіх дактрын сацыяльных утапістаў.

У полісістэме беларускай літаратуры і мастацтва рысы авангардызму адзначаюцца ў творах цэлага шэрагу аўтараў – Я. Купалы, Зм. Бядулі, А. Александровіча, М. Чарота, А. Дудара, Я. Пушчы, У. Жылкі, У. Дубоўкі і многіх іншых. М. Танк, увайшоўшы ў літаратурны працэс 1930-х гг., таксама адлюстраваў у ранніх вершах дыяпазон самых рознанакіраваных авангардысцкіх рэпертурэм, тэматыкі і стылістыкі сацыялістычнага рэалізму, што якраз пачаў сваё фарміраванне ў савецкай літаратуры.

Узаемадачыненні авангардызму і сацрэалізму ў танкаўскай лірыцы грунтуюцца на агульнай мэце гэтых мастацкіх з'яў – жаданні радыкальнай перабудовы свету на новых падставах, на магутным крытычным патэнцыяле, сацыяльным пратэсце, «создании нового мира с помощью организационных и технических методов социалистического строительства, в котором художник соединяет творчество и утилитаризм» [10, с. 45]. Акрамя таго, прадстаўнікі гэтых накірункаў вялікую ўвагу надаюць распрацоўцы такога аспекту мастацкага твора, як прагматыка, што фіксуе «отношения между текстом и субъектами текстовой деятельности (т.е. адресантом-автором и адресатом-читателем)» [11, с. 623]. Пры такім падыходзе мастацтва аказваецца сродкам выхавання, на думку М. Шапіра, «главным становится действенность искусства – оно призвано поразить, растормошить, взбудоражить, вызвать активную реакцию у человека со стороны» [12, с. 137].

У сваю чаргу сацрэалізм аднаўляе рысы творчай манеры знакамітых мастакоў-перадзвіжнікаў, што выкрывалі самыя вострыя праблемы грамадства – класавую няроўнасць, беднасць, сацыяльную несправядлівасць. Творам перадзвіжнікаў уласцівы падкрэсленая ўвага да лёсу простага чалавека, драматычнае выяўленне яго як пакутніка ад непасільнай працы, адлюстраванне невырашальных супярэчнасцей жыцця беднаты. Рэпертурэмы класавасці і палітычнай ангажаванасці знайшлі адбітак у лірыцы М. Танка 1930-х гадоў. Безумоўна, большасць вершаў прысвечана характэрнай тэме змагання, бунтарства, падполля, кратаў і чакання *«бітвы»*, *«агню»*, *«іскраў»*, *«зары»* з Усходу. Жыццё селяніна і рабочага намалявана паэтам як экзістэнцыяльная трагедыя, зневажанне і здзек нечалавечымі ўмовамі жыцця: *«Апухла галодная печ, / Ногі стала рахітычна аселі, / Нож заіржавеў / Ад бясконцай бясхлебіцы»* («Адозва», 1931) [13, с. 27]. Праз мастацкую дэталь расказвае паэт і пра акалічнасці жыцця на Усходніх Крэсах, у несвабодзе, у абцугах чужой улады: *«На суботы, нядзелі, / На сёлы, гарады / Намордні́кі надзелі, / Каб не крычалі з бяды»* [13, с. 27].

У вершах зборніка «На этапах» (1936) М. Танка наогул знікае станоўчы вобраз дома як мікрасвету, гарманізаванага адзінства зямнога і ўзвышанага, што характэрна і для авангардысцкіх канцэпцый разрыву, пераглядy, жыцця

ў віхуры супярэчнасцей і зломаў, і для метаду сацыялістычнага рэалізму, дзе дэкларавалася мастацтва ў формах жыцця, прынцыповае адмаўленне ад эстэтычных адносін да рэчаіснасці. Калі ў вершах М. Танка і з'яўляецца вобраз хаты, чалавечага жытла, то малюецца ён змрочнымі фарбамі: *«дзіравыя капялюшы стрэх»* («На касагоры»), *«саламяныя стрэхі, запалыя зрубы»* («Пацыфікацыя»), *«дзіравая карэлая пасцель»* («У падзямеллі»), *«батрацкія сялібы»* («Песня»), *«пакой, як скрыня, з глухім акном»* («Серп сонца»), *«хата-сіраціна»* («За песні і сасонкі…»), *«хаціна згорбленая, сырая»* («Песня кулікоў»), *«шэрыя хаты», «счарнелыя бэлькі», «у шчэрбінах печы клапы»* («Шэрыя хаты, платы і вароты…»). У пейзажных вершах першага зборніка знікае адчуванне адзінства чалавека і прыроды, якая малюецца часцей як халодны і варожы, паглынаючы пачатак: *«сцежкі, парослыя цернем, глухія»* («Песня»), *«замець праклятая»* («Грукаючы ў дзверы»), *«чорны, мокры вецер»* («Вагон калыша. Позні вечар…»), *«дыміць над выгарамі і над палямі туман»* («Нарач, як мора, шуміць…»), *«вечар пахмурны, чорны»* («У непагоду»), *«дождж густы, сцюдзёны сыпле», «перадрогшыя асіны»* («Над Прыпяццю»). Верш-партрэт лірычнага героя ўзнаўляе вобраз змагара, пакутніка, ахвярна адданага ідэі вызвалення. У такога героя *«дзіравыя сярмягі, кашулі», «нахмураныя бровы», «галодныя зрэнкі»* («Пацыфікацыя»), ён сам *«стары палітзак»* («Нарач, як мора, шуміць…»), што мае *«толькі кашаль і думы»* («У вагоне»), *«кашаль і сухоты», ён «родам з Палесся… год 20…», «твар высахшы і змрочны»* («Да дня»), яго *«брат закуты», а «рукі мазольныя»* («Не забывай»). Метафарычны партрэт такога героя створаны ў вершы з характэрнай назвай «Я – у кожным пажары…» (1935):

*Я – ў кожным пажары,*
*Я – полымя брат,*
*Я – ў кожным удары*
*Жалезных лапат.*

*Я – ў чорных загонах,*
*У скібах цяжкіх,*
*У кос пераззвоне*
*Між ніў залатых.*

*Я – ў скаргах, я – ў сьлёзах*
*І сірат і ўдоў,*
*Я – ў шуме бярозаў,*
*У гуле вятроў.*

*І што ўсе нягоды*
*Суровыя мне,*
*Драты, перашкоды*
*І краты ў вакне! [13, с. 46].*

У тэксце з чарады самавызначэнняў лірычнага героя паўстае, на першы погляд, рамантычны звышчалавек, выключны ў сваіх праявах. Вытокі такой канцэпцыі героя – у ідэі барацьбы, звязанай з вызваленнем, прадчуваннем свабоды. Але ў вершы здымаецца прынцыповае для мастацтва рамантызму супрацьстаянне героя і свету, знікае тэма адчужанасці, адзіноты – у пэўным сэнсе канфлікт можа быць вырашаны станоўча, без трагічнага вырашэння сітуацыі. Абавязковы сюжэтны паварот расчаравання ў людзях, комплекс трансцэндэнтальнага героя, «лішняга чалавека» не мае дачынення да персанажа верша «Я – у кожным пажары…», які выяўляе супольнасць з народам, яго духоўнымі сіламі. З другога боку, такі персанаж блізкі фальклорнай

паэтыцы, якая выключае прысутнасць індывідуальнага асобаснага пачатку і звязаных з ім супярэчнасцей. Праблема «“интеллигенции” и “народа” как коллективных субъектов с разными ментальностями, как носителей различных систем ценностей», па вызначэнні В. Цюпа [14, с. 11], не мае ніякага дачынення да танкаўскага героя – непадзельнай часткі лёсу Бацькаўшчыны і яе народа. Як адзначае М. Мікуліч, «М. Танк стварыў вобраз маладога падпольшчыка-рэвалюцыянера, прыгожага сваёй высакароднай ахвярнасцю змагара за інтарэсы народа, шырокай працоўнай грамады [15, с. 21–22].

У вершы «Я – у кожным пажары…» разбураецца звыклы хранатоп тэкстаў рамантызму, пабудаваны ці на геаграфічнай экзотыцы, ці на вертыкальных незвычайнасцях – іншых вымярэннях, боскіх ці д’ябальскіх існасцях. Пры гэтым адзначаецца дывергентнасць героя – ён і напружана эмацыянальны, чуллівы, і «сацыяльна арыентаваны», мужны, і трагічна гатовы на самаахвярнасць, і аптымістычна спадзяецца на лепшае. Твор напоўнены пафасам сцвярджэння, у ім гучыць адмаўленне пачварнага: усе цяжкасці, *«драты, перашкоды і краты»*, як абвяшчае герой, лёгка пераадольваюцца; нават назіраецца паэтызацыя рэчаіснасці, дзе побач са *«скаргамі» і «слязьмі»* ёсць месца *«шуму бяроз» і «залатым нівам»*. Згадка пра «краты ў вакне» дадае неабходнай дакументальнасці, дазваляе праз дэталь спасцігнуць цэлае.

У полісістэме ранняй танкаўскай лірыкі асаблівае месца займаюць рэпертуарныя мадэлі вуснай народнай творчасці. У намінатыўнай і лапідарнай форме гэтую ж думку выказвае і М. Арочка: «Фальклор – Купала – сусветная паэзія» [3, с. 81], адзначаючы складаную сінтэзаваную прыроду мастацкага пісьма М. Танка. У абставінах нацыянальнага ўціску, забароны любых сацыяльных інстытуцый на беларускай мове (адукацыя, сродкі масавай інфармацыі, кнігадрукаванне і інш.) у Заходняй Беларусі фальклор меў выключнае значэнне, быў непадкантрольнай формай духоўнага жыцця, функцыянавання і развіцця роднай мовы, своеасаблівым андэграўндам.

Звяртае на сябе ўвагу пашыранасць у першым зборніку М. Танка тэмы смерці. У традыцыйнай культуры гэты феномен шматбакова асэнсоўваецца, страх перад смерцю пераадольваецца гарманічным адчуваннем натуральнага прыроднага кругазвароту, што асабліва актуальна пры сельскагаспадарчым ладзе жыцця. У ранніх вершах М. Танка шматразова з’яўляецца цэлы корпус звыклых мартальных вобразаў: хвароба і голад героя, холад і змрочнасць прыроды, вечар і цемра. У танкаўскіх вершах набывае распаўсюджанасць амбівалентная сімволіка дарогі як падарожжа жыцця і шляху на той свет. Безумоўна, ужо ў назве зборніка «На этапах» зададзены ідэйна-тэматычныя дамінанты твораў: у 50-ці тэкстах (77 – агульная колькасць вершаў) сустракаюцца лексемы, звязаныя з семантыкай дарогі: *«дарога»* (20 разоў), *«шлях»* (8 разоў), *«этап»* у значэнні шляху зняволеных (6 разоў), *«каляіна»* (5 разоў), *«сцежка»* (5 разоў), а таксама па некалькі разоў словы *«брук»*, *«пуцявіна»*, *«завулкі»*, *«вуліцы»* і іншыя, што карэлююцца з ідэяй перамяшчэння і руху (*«след»*, *«крокі»*, *«ісці»*, *«калёсы»* і г. д.). Часцей за ўсё гэтыя дарогі цяжкія

і складаныя – *«сцежкі, парослыя цернем, глухія»* (верш «Песня»), *«дарога гразкая / І калёсы западаюць да ступіц»* (верш «Едуць цыганы…»), *«галосіць вецер там між пуцявін дарожных»* (верш «Санет»), *«каляіны этапных дарог»* (верш «Жнівом»). Але абсалютная большасць вершаў мае фальклорную перспектыву пераходу ад мартальнага да вітальнага: цемру пераразаюць *«усходы»*, *«зоры»*, *«іскры»* і *«маланкі»*.

Так, у вершы «Ціха, так ціха – ні ветру, ні шуму...» (1935) [13, с. 71] М. Танка намалявана царства смерці з усімі традыцыйнымі атрыбутамі: зімы як смерці прыроды, ночы як смерці дня, паралізаванасці гукаў, колераў, знясіленасці чалавека, неўміручасці сасны як вартаўніка між светам жыцця і светам смерці. Але такі цяжкі шлях, калі ісці няспынна, абавязкова прывядзе да лепшага:

*Ціха, так ціха – ні ветру, ні шуму...*
*Быццам лес белую думае думу.*
*Не зашуміць, не засвішча віхор,*
*Не шалахнецца заснежаны бор.*
*Цягнецца белы мой след адзінокі,*
*Цягнецца ў гурбах між сосен высокіх.*

*Ледзь пуцяводныя зоры відаць.*
*Думак бязследна плыве чарада.*
*Цяжка ісьці, прыстаюць ужо ногі, –*
*Толькі мне нельга спачыць ля дарогі,*
*Нельга спыніцца ў дрымотным бары...*
*Трэба няспынна ісці да зары!*

Арыштанцкія этапы ў вершах першага зборніка М. Танка ператвараюцца ў татальны сімвал заходнебеларускага жыцця, паэт распавядае пра пякельнае існаванне народа без свабоды, закутага, бы вязень, але выказвае рашучае спадзяванне на заўтрашні дзень, напрыклад, у вершы «Над Прыпяццю» (1936):

*Меле гром над полем хмары,*
*Дождж густы, сьцюдзёны сыпле*
*На палескія імшары*
*І на Прыпяць.*

*Ды шумяць каля дарогі*
*Перадрогшыя асіны.*
*Гразнуць зморaныя ногі*
*Ў каляінах...*

*– Што, этап яшчэ далёка?.. –*
*Не прыстаць, не прыпыніцца.*
*Толькі чуецца навокал*
*Навальніца.*

*Мы ідзём у час найгоршы*
*Сьветлай волі на спатканьне!*
*Гэта ўжо этап апошні, –*
*Заўтра ўстанем! [13, с. 93].*

Нават вершы-апяванні роднай прыроды, насычаныя вобразамі, звязанымі з архетыпічным матывам дарогі як скразнога, бясконцага руху, зменлівасці, быцця «на пераломе», «напярэдадні», становяцца сімвалічнай дамінантай, адлюстраваннем нацыянальнага разумення прасторы. У вершах М. Танка зборніка «На этапах» пейзажнага характару заўсёды прадстаўлены і вертыкальны, і гарызантальны рух. Вертыкальнае вымярэнне прасторы ў танкаўскіх вершах звязана с архаіка-фальклорнымі ўяўленнямі пра будову сусвету («зямля–неба», «прафаннае–сакральнае»), гарызантальнае арганізавана праз азначэнне вандравання па канкрэтных топасах (лес, поле, дарога):

*Вецер кудлаты на нівах калосьсе гайдае,*
*Стужкай дарога з-пад мокрых калёс выбягае*
*Там, дзе бярозы плакучае зьвесілі вецьце,*
*Там, дзе адны толькі хмары, і месяц, і вецер.*

*Іду па шляху пясчаным, няроўным.*
*Кій і торба песень вандроўных,*
*І ад астрога і да астрога плятусь –*
*Беларусь ты мая, Беларусь!* («На шляху дзікіх гусей», 1936) [13, с. 99].

Паводле А. Бельскага, «карціна прыроды, адмецінай якой з'яўляюцца незвычайная экспрэсіўнасць вобразнага мыслення, павышаная эмацыянальнасць, суб'ектыўна-псіхалагічная заглыбленасць пачуцця» [16, с. 19] можа быць аднесена да рамантычнага пейзажу. Рэпертурэмы рамантызму – кантраснасць вобразаў, маштабнасць і панарамнасць падзей, «прага гармоніі», «увасабленне нечага ідэальнага, прыгожага, душэўна блізкага і сугучнага чалавечай душы» [16, с. 19] праяўляюць сябе ў вершы «На шляху дзікіх гусей» нароўні з фальклорна-міфалагічнымі. Кожнае двухрадкоўе пабудавана на кантрасных вобразах-апазіцыях матэрыяльнага і ідэальнага, цёмнага і светлага: *вецер – нівы – стужка дарогі; бярозы – хмары, і месяц, і вецер; сны – цені – падарожныя бярозы; шлях – кій – торба – вандроўныя песні.* Асаблівую завостранасць набываюць апошнія радкі, дзе праз канкрэтныя локусы абвяшчаецца, адкуль і куды ідзе вандроўны: *«ад астрога да астрога».* У гэтым вершы ўжо ў назве актуалізуецца семантыка дарогі, перамяшчэння па метафарычным шляху птушак, што ляцяць па сваіх, толькі ім зразумелых маршрутах, але заўсёды вяртаюцца дадому. Дом, радзіма, родны кут, Беларусь – міфалагічны Цэнтр Сусвету, па якім так сумуе лірычны герой, шукаючы яго па ўсіх дарогах, пакутуючы па астрогах.

Гэтыя шляхі-дарогі М. Танка бясконцыя не толькі ў фізічным сэнсе, але і ў метафарычным – як Быццё. У М. Танка яны і сімвал барацьбы *(«брук грыміць ад грукату баёў»)*, і сімвал радзімы *(«над прасёлачнай дарогай, над маёю вёскай»)*, і сімвал прызначэння *(«мы ўшчэ ўсіх шляхоў не апелі»)*, і сімвал лёсу змагароў *(«па мядзельскім тракту бясконцы этап наш брыдзе»)*, і сімвал жыцця ў няволі *(«сцежкі, парослыя цернем, глухія»)*, і, што самае галоўнае, – сімвал часу, гісторыі Бацькаўшчыны, што складаецца з лёсаў людзей, што прабівалі гэты шлях, безупынна ішлі цяжкай пуцінай да незалежнай краіны.

Такім чынам, полісістэма вершаў першага зборніка «На этапах» М. Танка складаецца з рэпертурэм фальклорна-міфалагічнага характару, рамантызму, рыс мастацтва «перадзвіжнічаства», а таксама рэпертуарных мадэляў авангардызму ў яго розных праявах – ад эстэтыкі сацыялістычнага рэалізму да эксперыментальнай паэтыкі вершаскладання.

## ЛІТАРАТУРА


1. Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: у 4 кн. / І. С. Шпакоўскі [і інш]; рэд. : В. А. Каваленка, І. Я. Навуменка ; Акадэмія навук Беларусі. – Мінск : Нав. і тэхн., 1994. – Кн. 3: 1917–1941 гг. – 399 с.
2. *Мікуліч, М. У.* Максім Танк. Талент, заручаны з небам / М. У. Мікуліч. – Мінск : Літ. і маст., 2012. – 336 с.

3. *Арочка, М. М.* Максім Танк: Жыццё ў паэзіі / М. М. Арочка. – Мінск : Нав. і тэхн., 1984. – 272 с.
4. *Бугаёў, Дз. Я.* Паэзія Макіма Танка / Дз. Я. Бугаёў. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 311 с.
5. *Гніламёдаў, У. В.* Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 246 с.
6. *Рагойша, В. П.* Паэтыка Максіма Танка / В. П. Рагойша. – Мінск : Выд-ва БДУ імя У. І. Леніна, 1968. – 227 с.
7. *Верабей, А. Л.* Максім Танк і польская літаратура / А. Л. Верабей. – Мінск : Нав і тэхн., 1984. – 120 с.
8. *Чыквін, Я.* Імёны. Творы. Кантэкст. Артыкулы, рэцэнзіі, інтэрв'ю / Я. Чыквін. – Беласток : Белавежа, 2020. – 297 с.
9. *Тычко, Г. К.* Беларуская літаратура XIX–XX стагоддзяў: час і асобы / Г. К. Тычко. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, 2010. – 267 с.
10. *Гройс, Б.* Рождение социалистического реализма из духа русского авангарда / Б. Гройс // Вопросы литературы. – 1992. – № 1. – С. 42–61.
11. Постмодернизм. Энциклопедия / сост. и науч. ред. А. А. Грицанов, М. А. Можейко. – Минск : Интерпрессервис ; Книжный Дом, 2001. – 1040 с.
12. *Шапир, М. И.* Эстетический опыт XX века: авангард и постмодернизм / М. И. Шапир // Philologica. – 1995. – № 3/4. – С. 136–143.
13. *Танк, М.* Збор твораў у 6 тт. Т. 1. Вершы, паэмы. 1930–1945 / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 528 с.
14. *Тюпа, В. И.* Литература и ментальность / В. И. Тюпа. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2018. – 231 с.
15. *Мікуліч, М. У.* Лірычны герой у паэзіі Максіма Танка давераснёўскага перыяду / М. У. Мукуліч // Веснік Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка. – 2007. – № 1. – С. 18–23.
16. *Бельскі, А. І.* Жывая мова краявідаў: Пейзаж у беларускай паэзіі / А. И. Бельскі. – Мінск : Бел. гум. адукац.-культ. цэнтр, 1997. – 136 с.

*Поступила в редакцию 13.09.2021*